Список использованной литературы

1. Корчагин, Е.А. Компетентностный подход и традиционное представление о высшем образовании / Е.А. Корчагин, Р.С. Сафин // Высшее образование в России. – 2016. – № 11. – С. 47–54.

2. Кушнир, С.И. О проблемах преподавания истории для неисторических специальностей / С.И. Кушнир, О.Ю. Яльченко // Высшее образование в России. – 2020. – № 1. – С. 150–155.

3. Современные педагогические практики для социогуманитарной и управленческо-экономической подготовки бакалавров в области техники и технологии / Т.В. Калашникова, М.А. Макиенко; под ред. О.В. Блейхер. – Томск: Изд-во Том. политех. ун-та, 2016. – С. 2.

4. Рыбина, М. В. История – инженеру (к вопросу о содержании учебной дисциплины «История» в техническом вузе) / М.В. Рыбина // Вестник Ассоциации вузов туризма и сервиса. – 2017. – Т. 11. – № 4. – С. 21–25.

5. Егорова, Ю.А. Роль и значение гуманитарных дисциплин в структуре профессиональной подготовки будущих инженеров / Ю.А. Егорова // Ориентация воспитания на саморазвитие интеллигентности и конкурентоспособности личности: материалы XIX Всерос. науч. конф. / науч. ред. В.И. Андреев. – Казань: Центр инновационных технологий, 2009. – С. 112–118.

УДК 37.01:94

**Мяньчэня С.В., Грэбень Я.А., к.г.н., дацэнт**
Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт, г. Мінск

## ВЫХАВАЎЧЫ І АДУКАЦЫЙНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ МУЗЕЯ СЯЛЯНСКАЙ КУЛЬТУРЫ І ПОБЫТУ БДАТУ

Музей сялянскай культуры і побыту Беларускага дзяржаўнага агранага тэхнічнага ўніверсітэта распачаў сваю працу ў 1995 г. на базе кафедры філасофіі і гісторыі. Гэтай падзеі папярэднічала напружаная праца супрацоўнікаў універсітэта А.А. Лазавой, В.Г. Маскалёва, А.В. Патаповіча і інш. Музейная калекцыя пачала фарміравацца ў 1994 г. Улічваючы той факт, што студэнты ўніверсітэта ў асноўным паходзілі з сельскай мясцовасці і прадстаўлялі розныя рэгіёны краіны, было прынята рашэнне аб іх непасрэдным удзеле ў новым праекце. Студэнтам давалася заданне знайсці ў роднай мясцовасці этнаграфічны помнік, зрабіць яго апісанне і даставіць у музей. Гэта дало магчымасць стварыць фонд без спецыяльных экспедыцый і выдаткавання значных грашовых сродкаў. Аднак у той жа час некаторыя экспанаты маюць недакладную атрыбутыку (адсутнічае лакалізацыя, не заўсёды прапісана прызначэнне). На сённяшні момант музей, акрамя асноўнай этнаграфічнай калекцыі, мае калекцыю дакументаў і грашовых сродкаў XVII – пачатку XX стагоддзяў, археалагічныя экспанаты. Напаўненне музейнага фонду, які налічвае звыш 300 экспанатаў, хоць і не на сталай аснове, але працягваецца.

Сучасная навука разглядае музей як інстытут сацыяльнай памяці, які спрыяе перадачы інфармацыі з пакалення ў пакаленне і ўдзельнічае ў фарміраванні светапогляду, грамадскіх каштоўнасцей і арыентацый [0, с. 13]. Адна са значных сацыяльных функцый музея – функцыя культурнай арыентацыі і ідэнтыфікацыі, якая накіравана на кансалідацыю грамадства, самапазнанне і асэнсаванне асобай сваёй спадчыны [0, с. 272]. Музеі этнаграфічнага профілю, да якога належыць і наш музей, дэманструюць асаблівасці нацыянальнай традыцыйнай культуры, раскрываюць унікальнасць духоўнай і матэрыяльнай спадчыны беларускага народа. Успрыманню інфармацыі садзейнічае інтэр'ер музея, які стварае асобую атмасферу і дае эфект далучэння і прысутнасці. Афармленне музея сялянскай культуры і побыту ў выглядзе стылізаванай сялянскай хаты, адмысловыя сталы і лавы для наведвальнікаў цалкам адпавядаюць гэтаму крытэрыю. Спецыялісты аграрнага профілю, падрыхтоўкай якога мы займаемся, павінны адчуваць сваю сувязь з зямлёй, народам, яго традыцыямі ў некаторай ступені нават больш за іншых. І гэтую задачу дазваляе вырашыць музей.

Асноўнай формай работы са студэнтамі на базе музея сялянскай культуры і побыту з'яўляюцца аглядныя і тэматычныя экскурсіі. Першая выкарыстоўваецца для знаёмства з экспазіцыяй, асноўнымі экспанатамі. Яна прымяняецца для гасцей універсітэта, студэнтаў дзённага аддзялення на ўводных занятках па дысцыплінам гістарычнага профілю, студэнтаў-завочнікаў. Тэматычныя экскурсіі адбываюцца ў межах вывучэння гуманітарных дысцыплін – "Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі", "Гісторыка-культурная і духоўная спадчына беларускага народа", "Гісторыя беларус-

кай дзяржаўнасці”. Яны перш за ўсё звязаны з тэмамі традыцыйнай матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў: традыцыйныя заняткі, народны строй, асаблівасці побыту. Пад час правядзенні экскурсіі надзвычай важна ўлічваць індывідуальныя асаблівасці наведвальнікаў (іх узрост, узровень адукацыі) і, на аснове гэтага, рэгуляваць ход аповяду. Значную ролю грае таксама падтрыманне кантакта з аўдыторыяй праз пытанні аб тым, што гэта за экспанат, якая тэхналогія яго стварэння, прынцып дзеяння? Шмат хто са студэнтаў бачыў некаторыя прадметы ва ўласнай гаспадарцы, ці гаспадарках іх бабулі і дзядулі, але не ведае, што гэта за рэч, паколькія яна не выкарыстоўваецца ўжо працяглы час. У іншых наадварот, ёсць асабістыя гісторыі з іх выкарыстаннем. Гэта дазваляе сфарміраваць ашчадныя адносіны да этнаграфічнай спадчыны, зразумець сваю прыналежнасць да культуры народа, адчуць ўзаемасувязь з мноствам пакаленняў сваіх продкаў, для якіх гэтыя рэчы складалі аснову штодзённага жыцця.

Асобныя экспанаты можна інтэграваць у іншыя тэмы. Так, праз пашпарт селяніна Беластоцкай акругі можна выйсці на падзеі Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі, а археалагічныя экспанаты – крамянёвыя вырабы і каменная матыка – дапамагаюць падчас разгляду эпохі першабытнага грамадства. Пры гэтым знаёмства з музейным экспанатам можа адбыцца не толькі ў музеі, але і ў вучэбнай аўдыторыі. Тут можна выкарыстаць метад індукцыі. Перш за ўсё азнаёміцца з экспанатам, а затым, зацікавіўшы такім чынам студэнтаў, перайсці да разгляду падзей і ўмоў, у выніку якіх ён быў створаны.

Але ці толькі гістарычныя дысцыпліны зацікаўлены ў выкарыстанні музея? Упэўнены, што не. Гісторыя аграрных адносін, развіццё сельскагаспадарчай тэхнікі і тэхналогіі апрацоўкі глебы – вось няпоўны спіс тэм, якія з’яўляюцца міждысцыплінарнымі і разглядаюцца з розных аспектаў як гуманітарнымі, так і тэхнічнымі дысцыплінамі. Магчыма, пабудова 3D-мадэлі сахі і выяўленне ступені яе эфектыўнасці, можа стаць тэмай асобнай лабараторнай работы, якая будзе з цікаўнасцю ўспрынята студэнтамі.

Музей сялянскай культуры і побыту садзейнічае і ўсебаковаму развіццю студэнтаў. На базе музея дзейнічае гурток студэнцкага клуба “Этнаграфія Беларусі” (раней аддзяленне Гуманітарна-экалагічнага факультэта грамадскіх прафесій БДАТУ), дзе навучэнцы на паглыбленым узроўні знаёмяцца з традыцыйнай культурай Беларусі, вывучаюць асаблівасці матэрыяльнага і духоўнага жыцця беларускага грамадства, знаёмяцца з асновамі музейнай справы і краязнаўча-даследчыцкай дзейнасці.

Такім чынам, актыўнае выкарыстанне экспанатаў музея сялянскай культуры і побыту ў адукацыйным і выхаваўчым працэсе можа спрыяць лепшаму засваенню ведаў аб нашым мінулым, развіваць аналітычныя і даследчыцкія здольнасці маладых спецыялістаў аграпрамысловага комплексу, садзейнічаць фарміраванню грамадскіх пачуццяў гонару і павагі да стваральнай працы свайго народа.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Кузина, Н.В. Основы музееведения / Н.В. Кузина. – Нижний Новгород : Изд-во Нижегородского университета, 2013. – 151 с.

2. Пригодич, Д.И. Музеи Беларуси в XXI веке: социокультурная среда функционирования / Д.И. Пригодич // Музей і культурная спадчына: гісторыя, сучаснасць, погляд у будучыню : зборнік матэрыялаў міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, 27–28 чэрвеня 2017 г., Мінск / БДУ, Гістарычны фак., каф. этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў ; рэдкал.: А.А. Гужалоўскі [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2017. – С. 270–276.

УДК 355.233.11

**Крюковский В.Д., кандидат исторических наук, доцент**
Белорусский государственный аграрный технический университет, г. Минск

## ВОЕННО-ПРИКЛАДНАЯ ПОДГОТОВКА ШКОЛЬНИКОВ В БЕЛАРУСИ (1924–1925 ГГ.)

Образование СССР, вхождение в состав ССРБ восточно-белорусских земель создали благоприятные условия для развития социально-политической и культурно-национальной жизни белорусского народа. В связи с предпринятыми мерами по преобразованию республики, формированию научного мировоззрения, идейной убежденности, волевых качеств молодого поколения значительно повысилась значимость физической и оборонно-массовой работы с учащимися школ. Не случайно в решениях